УДК 811.161.3

М.У. Гуль, Брэст, Беларусь

# ПЕРЫЯДЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ (1920-Я ГГ. – ПАЧАТАК XXI СТ.)

Abstract: the author describes puristic, anti-puristic, the modified anti-puristic, the modified puristic and modern periods in the formation of Belarusian philosophical terminology. The lexicographic works containing philosophical terms are given within each period. The author traces the formation of Belarusian philosophical terminology paying attention to the origin and structure of the terms.

Асобныя беларускія філасофскія тэрміны сустракаюцца ў працах Л.А. Антанюк, А.Я. Баханькова, А.М. Булыкі, С.М. Запрудскага, В.П. Краснея, М.І. Крукоўскага, А.Я. Міхневіча, Б.А. Плотнікава, А.А. Скікевіча, А.А. Станкевіч, У.С. Шчура, В.К. Шчэрбіна. Першым грунтоўным даследаваннем беларускай філасофскай тэрміналогіі стала кандыдацкая дысертацыя Ю.М. Лук’янюк “Сучасная беларуская філасофская тэрміналогія (семантычны і структурны аспекты)”. У працы ўпершыню сістэмна апісваецца філасофская тэрміналогія беларускай мовы на лексіка-семантычным, структурна-словаўтваральным і генетычным узроўнях; раскрыты асноўныя крыніцы фарміравання гэтай галіновай тэрміналогіі. У дысертацыі “Іншамоўная лексіка ў працэсе станаўлення і развіцця беларускай тэрміналогіі (на матэрыяле тэрмінасістэм філалогіі, філасофіі і сацыялогіі)” разглядаюцца перыяды станаўлення беларускай філасофскай тэрміналогіі, а таксама шляхі і спосабы пранікнення запазычанняў у даследаваную тэрмінасістэму.

Распрацаваная намі перыядызацыя грунтуецца на навуковых распрацоўках П. Векслера і Д. Дзятко [1 ; 2]. Намі выдзелены пурыстычны (1921–1933), антыпурыстычны (1933–1941), мадыфікаваны антыпурыстычны (1955 – 1990), мадыфікаваны пурыстычны (1990 – 1996), сучасны (з 1996) перыяды.

**Пурыстычны перыяд**. У лютым 1921 г. па рашэнні ЦВК БССР была створана Навукова-тэрміналагічная камісія (НТК). Плёнам працы НТК сталі выдадзеныя ў 1922–1930 гг. 23 тэрміналагічныя зборнікі ў выглядзе руска-беларускіх слоўнікаў пад назвай “Беларуская навуковая тэрмінолёгія”, якія былі задуманы як праекты. Выпуск 11

“Грамадазнаўства” (Мінск, 1927 ; укладальнік праекта Уладзіслаў Чаржынскі) уключае і нешматлікія філасофскія тэрміны: *антропоморфізм, матэрыялізм, матэрыялісты, рацыяналізм, схолястыка, сьветагляд, філёзоф, філёзофія* і інш.

**Антыпурыстычны перыяд.** Прынягце пастановы Савета народных камісараў БССР ад 26 жніўня 1933 г. *Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу* лічыцца пачаткам гэтага перыяду. У 1930-я гг. набыткі папярэдняга перыяду былі раскрытыкаваны. АН БССР пачала падрыхтоўку Беларускай савецкай энцыклапедыі, у 1935 г. былі выдадзены праекты слоўнікаў, сярод якіх – Выпуск 1. *Філасофія, псіхалогія, антырэлігійны аддзел* (Мінск). Раздзел *Філасофія* гэтага выпуску складаецца з 539 рэестравых слоў: як тэрмінаў (*анталогія, антрапасофія, атамізм*, усяго 380 адзінак), так і ўласных імёнаў (*Анаксагор, Анаксімандр, Анаксімен*, усяго 159 адзінак).

У даследаванай тэрміналогіі ўтрымліваецца значная колькасць іншамоўных тэрмінаў (усяго 243); гэта найперш словы грэка-лацінскага паходжання: *гармонія, геацэнтрызм, гіпотэза, гнасеалогія, догма, іманентны, кінікі, космас, логас, прынцып, сафізм* і інш.; а таксама галіцызмы: *ідэалізм, ідэалогія, імаралізм, нацыя*; германізмы: *гегельянства, кантыянства, махізм, натурфіласофія, ніцшэанства*; нешматлікія паланізмы: *асоба, гвалт, мэта*. Для гэтага раздзела характэрна даволі значная колькасць русізмаў (25 адзінак); некаторыя з іх у пазнейшых крыніцах заменены сваямоўнымі адпаведнікамі: *відзімасць – бачнасць* (РБС-70), *даставернасць – верагоднасць* (РБС-70), *доўг – доўг* (взятое взаймы), *абавязак* (обязанность, РБС-70), *звядзенне – звесткі* (РБС-70), *мышленне – мысленне* (РБС-70), *сазнанне – свядомасць* (РБС-70).

З агульнай колькасці тэрмігаў (380) 62 адзінкі з’яўляюцца састаўнымі тэрмінамі, якія пабудаваны па мадэлях: Adj + N (*візантыйская філасофія, вульгарны матэрыялізм, двойственая ісціна, умазрыцельная філасофія*); N + N (*барацьба класаў, класіфікацыя навук, свабода волі*), N + prep + N (*рэч у сабе*); N + N + N (*законы эканоміі мышлення*). Сустракаюцца і квазітэрміны, звязаныя не падпарадкавальнымі, а злучальнымі адносінамі (*лагічнае і гістарычнае, матэрыялізм і эмпірыёкрытыцызм*). Моналексемныя тэрміны ўключаюць назоўнікі з фармантамі -асць (*вечнасць, выпадковасць, магчымасць*), -енн-е (*адмаўленне, адцягненне*), -нн-е (*назіранне, назіранне*), -ств-а (*адзінства, грамадства*); су- (*суадносіны*), не- (*небыццё*); кампазіты (*богабудаўніцтва, узаемадзеянне, умапогляд*); прыметнікі з суфіксам -н- (*апрыёрны, апастэёрны*). Таксама зафіксаны і назоўнікі, утвораныя марфолага-сінтаксічным спосабам: *непазнавальнае, прыватнае*.

**Мадыфікаваны антыпурыстычны перыяд**. Пачаткам гэтага перыяду паслужыла стварэнне сектара тэрміналогіі ў Інстытуце мовазнаўства АН БССР у 1955 г. У гэтым сектары распрацаваны грунтоўны (на 17 тыс. тэрмінаў) *Русско-белорусский словарь общественно-политической терминологии* пад рэд. М.В. Бірылы і М.Р. Судніка (Мінск, 1970), які выходзіць за рамкі перакладнога і набывае ролю нарматыўнага тэрміналагічнага слоўніка. РБС-70 утрымлівае значную колькасць філасофскіх тэрмінаў (2289 адзінак). Філасофскія тэрміны таксама пададзены ў 12-томнай *Беларускай савецкай энцыклапедыі* (Мінск, 1969–1975).

У выбарцы філасофскіх тэрмінаў з РБС-70 зафіксавана 349 запазычанняў, большасць з якіх грэка-лацінскага паходжання: *абстракцыя, аксіялогія, акцыдэнцыя, антыномія, антыцыпацыя, апрапрыяцыя, атараксія* і інш. Галіцызмы складаюць даволі значную групу сярод запазычанняў: *вальтэр'янства, віталізм, дуалізм, імаралізм, інтуітывізм, квіетызм* і інш. Колькасць русізмаў нязначная: *абшчына, бакунізм, марксізм-ленінізм, народніцтва, паняцце, саслоўе*.

У параўнанні з папярэднім перыядам, па-першае, значна павялічылася колькасць састаўных тэрмінаў (зафіксавана 1650 адзінак), па-другое, павялічылася колькасць мадэляў, з'явіліся трох-, чатырох- і пяцікампанентныя тэрміны (*абсалютнае адзінства процілегласцей; абсалютнае адзінства якасці і колькасці; вышэйшая стадыя развіцця арганічнай матэрыі*). Як і ў папярэднім перыядзе, маналексемныя тэрміны ўключаюць утварэнні з фармантамі -асць, -енн-е, -нн-е, -ств-а, так і з фармантамі -ацыј-а (*дэмакратызацыя, фашызацыя*), -(л)ізм (*субстанцыялізм*).

**Мадыфікаваны пурыстычны перыяд**. Пачатак гэтага перыяду звязаны з прыняццем закона *Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь* ад 26 студзеня 1990 г. У гэты перыяд выйшлі з друку *Кароткі тлумачальны слоўнік філасофскіх, сацыяльных і культуралагічных тэрмінаў* пад рэд. М.Н. Бяспамятных (Гродна, 1992), які ўтрымлівае 108 філасофскіх тэрмінаў, і *Англа-беларускі слоўнік грамадска-палітычнай лексікі* Л.Т. Карповіча, Л.А. Казыры (Мінск, 1993). На мяжы двух перыядаў надрукаваны *Тэрміналагічна-тлумачальны слоўнік па філасофіі* А.А. Скікевіча, У.С. Шчура (Мінск, 1996). Са 108 тэрмінаў толькі 2 (*мадэліраванне, навукова-тэхнічная рэвалюцыя*) не зафіксаваны ў РБС-70.

**Сучасны перыяд.** Пачатак гэтага перыяду асацыіруецца са зменамі, унесенымі ў Кастытуцыю Рэспублікі Беларусь 27 лістапада 1996 г. Філасофскія тэрміны фіксуюцца ў энцыклапедычным даведніку для школьнікаў *Чалавек і грамадства* (Мінск, 1998), 18-томнай *Беларускай энцыклапедыі* (Мінск, 1996–2004), *Хрысціянскім філасофскім*

*зборніку* (Мінск, 2001), *Беларускім палітычным слоўніку* В.В. Шынкарова, С.П. Раманавай (Мінск, 2011), *Энцыклапедычным слоўніку рэлігійнай лексікі беларускай мовы* У.М. Завальнюка, М.Р. Прыгодзіча, В.К. Раманцэвіч (Мінск, 2013). Намі зроблена выбарка філасофскіх тэрмінаў з *Тэрміналагічна-тлумачальнага слоўніка па філасофіі*, *Беларускай энцыклапедыі*, *Беларускага палітычнага слоўніка* (усяго 1332 адзінкі).

Як і ў папярэднія перыяды, большасць сярод запазычанняў складаюць тэрміны грэка-лацінскага паходжання: *імператыў, інтэлегібельны, кантынуум, крэацыянізм, субстанцыя, сцыентызм, універсаліі, эвалюцыя, экзістэнцыя*. У гэты перыяд упершыню зафіксаваны такія тэрміны, як *акультурацыя, інтэракцыянізм, постмадэрнізм, постпазітывізм, структуралізм, трайбалізм, тэст, эскапізм* (англіцызмы), *дыскурс, тэярдызм* (галіцызмы).

У гэты перыяд узрастае колькасць адзінак з фармантам -ізм/-ызм (*гегеманізм, фаварытызм, экалагізм*), -ацыj-а (*вестэрнізацыя, глабалізацыя, фемінізацыя*); з’явіліся ўтварэнні з фармантам -ык-а (*глабалістыка*). Як і ў папярэдні перыяд, сярод састаўных тэрмінаў фіксуюцца двух-, трох-, чатырох- і пяцікампанентныя мадэлі; у даследаванай тэрміналогіі зафіксаваны ўтварэнні з фармантамі -асць, -енн-е, -нн-е, -ств-а, кампазіты, тэрміны, утвораныя марфолага-сінтаксічным спосабам.

На працягу усяго даследаванага перыяду сярод запазычанняў у беларускай філасофскай тэрміналогіі дамінуюць грэцызмы і лацінізмы. У крыніцах антыпурыстычнага перыяду утрмыліваецца значная колькасць русізмаў, некаторыя з якіх былі заменены сваямоўнымі тэрмінамі ў наступныя перыяды. У крыніцах сучаснага перыяду расце колькасць англіцызмаў. Для беларускай філасофскай тэрміналогіі характэрны тэрміны з фармантамі -асць, -ацыj-а, -енн-е, -ізм/-ызм, -нн-е, -ств-а; а таксама састаўныя тэрміны.

## Спіс скарачэнняў

**РБС-70** – Русско-белорусский словарь общественно-политической терминологии / АН БССР, Ин-т языкознания им. Якуба Коласа ; под ред. Н. В. Бирилло [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1970. – 452 с.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Wexler, P. Belorussification, Russification and Polonization Trends in the Belorussian Language 1890–1982 / P. Wexler // Sociolinguistic Perspectives on Soviet National Languages : Their Past, Present and Future / ed. by Isabelle T. Kreindler. – Berlin ; New York ; Amsterdam : Mouton de Gruyter, 1985. – P. 37–56.

2. Дзятко, Д. В. Фарміраванне і склад беларускай матэматычнай тэрміналогіі : дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / Д. В. Дзятко. – Мінск, 2006. – 167 л.